

Хачу, каб лета не канчалася ніколі.
Каб сонейка нас грэла круглы год.
І горы кветак, кветак мора
няхай цвітуць, а не наадварот.
Купацца хочаш? Калі ласка!
Плыві, балдзей, паплёскаў — загарай.
Не надаесць ніколі, нават з годам —
і радасць дзецям, і дарослым рай.
А смак у лета самы разнастайны:
салодкі, кіслы, ягадны, грыбны,
вішнёвы, яблачны, кавунны, мятны,
мядовы, зерневы і бульбяны.
Мне даспадобы дождж<ы>к цёплы, летні,
калі ён ціхенька пастуквае ў акно.
Умые лесу і садоў адзенне,
і свежае паветра заадно.
Бясконца лета – то й заняткаў куча,
у радасці маёй няма мяжы.
Прачнулася, паела, накупалась…
гуляй сабе або чытай, ляжы.
Але чакайце: як жа я без школы?
Мае сяброўкі будуць без мяне?
А снег? А восень? Падарункаў горы
пад елкай у Каляды?
не…
Хай будзе так, як створана прыродай:
і белы снег, і золата лясоў,
зіма за летам, восень за вясною,
буслы ляцяць із выраю дамоў.
Аб леце нам нагадваць будуць
здымкі,
гарбата з траў лясных і бронзавы
загар.
У зімовы вечар з пледам у абдымку
ізноў чакаць я буду летні дар.



Рэзнікава Сафія